№ 36 (485)
Верасень 2013 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

У нумары:

☞ Рэгіён: *краязнаўчы падручнік для студэнтаў Магілёўшчыны* – стар. 3

☞ Асоба: *190-годдзе «вясковага лірніка»* – стар. 4

☞ Землякі: *Ігнаценка, беларускі мастак у Малдове* – стар. 6



«Уздзвіжанне – апошні воз з поля рушыў, а птушкі ў вырай пацягнуліся»

Пра святкаванне восеньскага раўнадзенства чытайце на стар. 2

На тым тыдні...

✓**19 верасня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адкрылі **выстаўку «Якуб Колас у творчасці скульптараў»**, прысвечаную ўшанаванню памяці пісьменніка ў манументальным мастацтве. Упершыню ў рамках акцыі «Адкрытыя фонды» ў музеі прадстаўленыя творы мастацтва з калекцыі «Скульптура». Тут можна пазнаёміцца з працамі З. Азгура. А. Глебава, С. Селіханава, А. Заспіцкага, У. Слінчанкі, Л. і М. Раберманаў, У. Летуна, У. Церабуна.

✓**19 верасня** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылі **выстаўку, прысвечаную 150-годдзю паўстання 1863–1864 гг.**

Экспазіцыя складаецца з дзвюх тэматычных частак. Адзін з раздзелаў, падрыхтаваны Галоўным архівам старажытных актаў сумесна з Генеральнай дырэкцыяй Дзяржаўных архіваў і іншымі архівамі Польшчы, прэзентуе рукапісныя і друкаваныя дакументы, а таксама іканаграфічныя матэрыялы і фотаздымкі з польскіх архіваў. Архіўныя матэрыялы дапаўняюць фотаздымкі, атрыманыя з Нацыянальнага лічбавага архіва Рэспублікі Польшча, і экспанаты з калекцыі аддзела мастацкіх рамёстваў і гістарычных каштоўнасцяў Варшаўскага гістарычнага музея. Другі раздзел экспазіцыі складаецца з матэрыялаў, падрыхтаваных Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь: творы графікі, узоры фалерыстыкі, сфрагістыкі і іншыя помнікі XIX ст.

✓**20 верасня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася сумесная вечарына з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры **«Шчаслівай долю назаві...»**, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння паэткі, перакладчыцы, грамадскай дзяячкі Ніны Мацяш. У вечарыне бралі ўдзел сябры паэтэсы, вядомыя беларускія пісьменнікі, навукоўцы, журналісты, студэнты і школьнікі розных навучальных установаў нашай сталіцы.

Адмыслова да імпрэзы была падрыхтаваная міні-выстаўка **«Агмень яе душы»**.

✓**21 верасня** ў г. Мёры прайшло **абласное свята нацыянальных культураў, беларускай кухні і гульні «Нас аб'яднала зямля Беларусі»**. Гэта адборачны тур X Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культураў. Адбыліся канцэрт самадзейных мастацкіх калектываў Віцебскай вобласці, выстаўкі дэкаратыўна-ўжытковай творчасці і нацыянальных кухань. У рамках свята настаўнік і краязнаўца Вітаўт Ермалёнак прадставіў выстаўку са старадаўніх рэчаў, што паходзяць з колішняга Браслаўскага павета (сярод іх – кубак пачатку XX ст., люстэрка, што належала Эміліі Плятэр).

Юбілей гасціннага дома Адама Міцкевіча

З нагоды 75-годдзя з дня адкрыцця Дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку 13 верасня прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы. Паспрабуем разам прайсці юбілейнымі сцежкамі гэтай установы (дарэчы, старэйшага літаратурнага музея краіны). Установы, якую за летнія месяцы наведвалі прыкладна па тры тысячы чалавек, з якіх кожны трэці – замежнік.

Пачаліся ўрачыстасці з паказу відэафільма «Адам Міцкевіч» і агляднай экскурсіі. А паглядзець тут ёсць што – экспазіцыя музея абноўленая, цяпер тут вялікі акцэнт надаецца побыту часоў, калі ў Навагрудку жылі Міцкевічы. Потым у рамках праекта «Памятаем пра Міцкевіча» адбылося адкрыццё дзвюх выставак – дом песняра Літвы яшчэ і папулярная выставачная зала. Фотавыстаўка «Помнікі А. Міцкевічу ў свеце» распавядае, як памяць пра нашага геніяльнага земляка ўшанавая ў цэлым свеце. Вырабы ў тэхніцы дэкупаж прадстаўленыя на выстаўцы «Прыгожым тое падаецца, што зробленае з любоўю». Думаецца, прыгажосць тую ўпадабаў бы і сам пан Адам. Прыемным дадаткам да імпрэзаў стаў канцэрт навучэнцаў Навагрудскай дзіцячай школы мастацтваў, у выкананні якіх прагучалі творы класічнай музыкі. Для тых, хто прыехаў у сталіцу Вялікага Княства Літоўскага з іншых месцаў колісь вялікай дзяржавы, быў адведзены час на знаёмства з горадам, з мясцінамі, дзе хадзіў і аўтар «Пана Тадэвуша».

Н. Гурына і Л. Усэнка

Цэнтральным жа мерапрыемствам стаў круглы стол. Пачаўся ён з прывітання ад Навагрудскага райвыканкама і Гродзенскага аблвыканкама – словы прыязнасці і пажаданняў развіцця ўстановы сказалі Алена Ермакова, Аксана Коханава, а таксама калегі з розных установаў Навагрудка – дома культуры, музычнай школы, цэнтра дзіцячай творчасці, раённай бібліятэкі. Яны распавялі між іншага, што сёлета бібліятэкары горада праехалі па аграгарадках раёна, каб распавесці іх жыхарам пра музей, а выкладчыкі музычнай школы зазначылі, што для іх вучняў выступленне ў Міцкевічавым доме – своеасаблівая ўзнагарода. Дырэктар раённага краязнаўчага музея Тамара Вяршыцкая заклікала калегаў працаваць так, «каб сюды ехалі з усяго свету даведацца, дзе сталеў Адам Міцкевіч, адкуль карані ягонага таленту».

(Заканчэнне на стар. 2)

«Зямля — аснова ўсёй Айчыне»

Такую назву сёлета мае XXVIII Міжнародная навуковая канферэнцыя (яна адбудзецца 1 лістапада), прысвечаная 90-годдзю выхаду з друку паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». Да ўдзелу ў канферэнцыі запрашаюцца спецыялісты ў сферы навуковага коласазнаўства, гісторыі беларускай літаратуры XIX–XX стст., архівісты, журналісты, культуролагі, спецыялісты музейнай справы.

Асноўнымі мэтамі канферэнцыі з'яўляюцца літаратуразнаўчы і культуралагічны аналіз творчасці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, роля яго паэтычных твораў 1920–1930-х гг. у станаўленні беларускай літаратуры XX ст. і шмталікіх галінаў культуры Беларусі, кансалідацыя творчых і навуковых сілаў вядучых навучальных установаў Рэспублікі Беларусь і краінаў замежжа па ўсебаковым вывучэнні і шматаспектнай папулярызацыі творчай спадчыны народнага паэта Беларусі і інш.

Праблематыка канферэнцыі:

– паэма «Новая зямля» Якуба Коласа як вызначальны вектар развіцця нацыянальнай ідэі Беларусі на мяжы стагоддзяў;

– паэтычная спадчына Якуба Коласа ва ўспрыняцці маладога пакалення чытачоў;

– да пытання творчай пераемнасці: коласаўскія традыцыі ў сучаснай беларускай літаратуры;

– асобы з акружэння Якуба Коласа: дабрачынная дапамога песняра людзям, творчыя і дзелавыя кантакты паэта перыяду 1920–1930 гг. (да выяўлення новых персаналіяў);

– коласазнаўства ў XXI ст.: творчы пошук і новыя метадалагічныя аспекты;

– навуковае коласазнаўства і актуальныя пытанні экспазіцыйнай дзейнасці музея.

Узнятыя праблемы будуць разгледжаныя ў фармаце пленарнага і секцыйных пасяджэнняў у памяшканні Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Рабочыя мовы канферэнцыі – беларуская, руская, іншыя славянскія. Па выніках працы канферэнцыі будзе выдадзены зборнік матэрыялаў «Каласавіны».

Тэрмін падачы заявак – да 1 кастрычніка 2013 года.

Паводле інфармацыі арганізатараў

Раўнадзенства па-беларуску

У гэтым годзе восеньскае раўнадзенства, якое прыйшлося акурат на выхадныя дні, адзначалі ў этнакраме «Рагна» (сёлета яна адкрылася ў Мінску на рагу вуліцаў Сухой і Караля). Імпрэза адбывалася два дні і прыцягнула да сябе ўвагу шырокага кола цікаўных.

20 верасня ўсіх чакаў на канцэрце бард Яўген Барышнікаў. Трэба адзначыць, што імпрэза сабрала нямала людзей, памяшканне крамы было запоўненае бітма, але на атмасферу вечара гэта не паўплывала. Слухачы расселіся проста на падлозе, а тыя, хто не паспеў заняць такое выгоднае месца, слухалі стоячы. Зрэшты, калі мастацтва вымагае пэўных ахвяраў, хай сабе і натомленых ад двухгадзіннага канцэрта ног, гэта сведчыць толькі на карысць майстэрства выканаўцы.

Я. Барышнікаў

Выступленне Я. Барышнікава сталася проста чароўным дзействам. Канцэрт пачаўся яшчэ засветла, а сёмай гадзіне вечара, і было добра відаць, як паступова за вакном збіраюцца прыцемкі. Святло ў памяшканні прытушылі, ад некалькіх запаленых свечак на сценах дрыжэлі цені. Калі побач з крамай праязджалі машыны і падсвечвалі вокны фарамі, цені варушыліся, хіліліся адна да адной. Ад гэтай гульні святла нават у поўным людзей памяшканні рабілася крыху ніякавата, і мімаволі сярод ценяў вочы шукалі абрысы Змея – таго самага, пра якога спяваў Я. Барышнікаў:

Ляцеў сабе Змей
па-над краем азёраў,
Ляцеў сабе Змей,
адбіваўся ў празрыстай
вадзе,
Ляцеў сабе Змей,
там дзе рэкі хаду
пачынаюць да мора,
Там дзе шуму дуброваў
туруе святар на дудзе...

Як вядома, восеньскае раўнадзенства ці, інакш кажучы, Уздзвіжанне лічыцца тым часам, калі птушкі адлятаюць у вырай, а змеі хаваюцца ў норы. Таму з гэтай нагоды на наступны дзень у этнакраме адбыўся майстар-клас па вырабе птушак з саломы і сітніку. Таццяна Сцяпурка проста і зразумела расказвала пра ўсе тонкасці пляцення з саломы, а таксама дзялілася сваімі сакрэтамі, якіх у яе, як высветлілася, нямала. І пад уважлівым позіркам майстра ды з дапамогаю яе вопытных рук з палосачак саломы паступова паўставалі маленькія галоўкі, гнуткія крылцы, тонкія дзюбкі... Напрыканцы імпрэзы пад столлю крамы сабралася цэлая чарада сонечна-жоўтых птушачак. Праўда, у вырай яны не паляцяць, але затое стануць добрым упрыгожаннем і каляднай елкі, і велікоднага стала. А пакуль што птушкі з саломы ціхенька спяць, схаваўшы галовы пад крылы, і – хто ведае? – пільна сочаць адным вочкам за гаманлівымі чародамі, што кружаць у восеньскім небе.

Ніна КАЗЛЕНЯ, фота аўтара

Юбілей гасціннага дома Адама Міцкевіча

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Сённяшні дырэктар Мікалай Гайба распавёў прысутным пра тое, як ствараліся новая экспазіцыя, як паўставаў сядзібны ансамбль, кароткa пазнаёміў з тымі, хто кіраваў установаю да яго, з цяперашнімі супрацоўнікамі. І ці тое пажартаваў, ці проста канстатаваў, што свой род ведае ад канца XVII ст., але радавод А. Міцкевіча ведае лепей.

– Сучасны музейны ансамбль быў адкрыты за год да таго, як Беларусь атрымала Незалежнасць. Не дзіва, што была вялікая цікавасць да Адама Міцкевіча. Ды й пачаў успрымацца ён як і беларускі паэт, – адзначыў спадар дырэктар.

Шмат на юбілеі было польскіх гасцей. Выступаючы, дырэктар Польскага Інстытута ў Беларусі Уршуля Дарашэўская адзначыла ролю асобы Міцкевіча ў яднанні народаў, а таксама падаравала кнігу Ю. Славацкага, што нядаўна інстытут выдаў па-беларуску. Цікавым было знаёмства з Дамінікам Абламовічам, які прадстаўляў тут адразу два музеі ў Сілезіі (рэгіён у Польшчы) – «Muzeum laskie» ў Катавіцах і Верхнесілезскі музей у Бытаме. Ён не першы раз у Навагрудку, у доме Міцкевічаў, даўно сябруе з ягонымі супрацоўнікамі. І гэтым разам прыехаў не з пустымі рукамі, прывёз віншавальныя лісты ад палякаў Сілезіі, кіраўніцтва краю, а таксама кнігі, выяву Катавіцаў у даўнія часы, звесткі з польскіх друкаваных і інтэрнэтавых крыніцаў, што тычацца Навагрудчыны, запісаныя на лазерную кружэлку. Ёсць у госця і сваё зацікаўленне Навагрудчынай, асабістая прыязнасць – прадзеды ягоныя паходзяць з Негарэлага, якое напачатку мінулага стагоддзя два дзясяткі гадоў было памежным, між БССР і Польскаю дзяржавай. Адзін з ягоных прапрадзедаў быў навагрудскім віцэ-маршалкам і пахаваны на гарадкіх могілках.

Д. Абламовіч

М. Тайба, К. Кашталанава і В. Кручок

Гвае словы шчырай прыязнасці і пажаданняў далейшых поспехаў калегам выказалі супрацоўнікі мінскіх Літаратурнага музея Вольга Гулеева і Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Ірына Мышкавец.

Цікавымі былі ўзгадкі пра мінулае Міцкевічавага дома былых дырэктараў установы Лілії Усэнка і Ніны Гурынай. Акурат у часы Лілії Уладзіміраўны музей пачаў набываць той выгляд, што мае цяпер. Аднаго разу жанчына задумалася, што існуюць сядзібныя ансамблі Льва Талстога, Аляксандра Пушкіна, іншых класікаў, а ў Навагрудку – толькі будынак дома гаспадароў. І паціху пачала разрастацца сядзіба – з'явіліся флігель, свіран, альтанка... Дапамагалі ў рэканструкцыі як беларускія Міністэрства культуры і Беларускі фонд культуры, гэтак і польскія ўстановы, польскія фірмы.

Напрыканцы круглага стала прайшло ўзнагароджванне ўдзельнікаў літаратурнага конкурсу «Прысвячэнні Песняру». Як найлепшы адзначаны малюнак Кацярыны Кашталанавай з СШ № 186 г. Мінска, якая на юбілей прыехала са сваёй настаўніцай Вольгай Кручок. Алена Ясэк з в. Астроўна Навагрудскага раёна перамагла ў паэтычным конкурсе. Дарэчы, яна магістр гістарычных навук, займаецца археалогіяй. Спадзяемся, з гэтымі ды іншымі ўшанавальнікамі імя славутага земляка мы яшчэ сустрэнемся на старонках «Краязнаўчай газеты».

Гскончыўся першы дзень выступленнем Тэатра аднаго акцёра «Зьніч». У доме Адама Міцкевіча прагучала монаопера «Адзінокі птах». Разам з выканаўцам ролі паэта Андрэем Марозавым у гасцінны дом завіталі кампазітар, аўтар музыкі Алег Залётнеў, кіраўнік тэатра Галіна Дзягілева ды іншыя «зьнічаўцы».

...Стамбул, гукі ўсходняга горада, мора... І сталы Міцкевіч, які пераасэнсоўвае жыццё, узгадвае найбольш яскравыя яго моманты, падводзіць своеасаблівую рысу. У выдатным выкананні ў гістарычным будынку ўсё тое гучала паасабліваму. Ды й сам А. Марозаў надзвычай удала паказаў сваё бачанне таго скрушнага для Міцкевіча часу.

Другі дзень прайшоў у вандроўцы гасцей музея па мясцінах, звязаных з А. Міцкевічам, – Навагрудак і Завоссе, возера Свіцязь.

Уладзімір ПУЧЫНСКІ, фота аўтара

Бярэзінскі пясняр прыроды

Бярэзіншчына здаўна славіцца сваімі талентамі ў галіне літаратуры. Тут нарадзіліся, жылі і працавалі такія вядомыя пісьменнікі і літаратуразнаўцы, як Рыгор Няхай, Міхась Скрыпка, Якуб Ермаловіч, Пятро Рунец, Рыгор Ігнаценка, Іван Маркевіч і інш.

Раённая бібліятэка з'яўляецца ў вобласці базавай па вывучэнні і прапагандзе літаратурнага краязнаўства, арганізацыі і правядзенні цікавых сустрэчаў з вядомымі беларускімі пісьменнікамі, арганізацыі спазнавальных вандровак па гарадах і гістарычных мясцінах нашай краіны. Сярод бібліятэк раёна па краязнаўча-пошукавай працы ў галіне літаратуры пачэснае месца займае Паплаўская бібліятэка, якую ўзначальвае спецыяліст з вышэйшай адукацыяй Валянціна Наскавец. У выніку краязнаўча-пошукавых аперацыяў «Быць гісторыкам сваёй вёскі» павялічыўся багаж назапашаных матэрыялаў з гісторыі паплаўскіх вёсак. Афармленыя матэрыялы былі прадстаўленыя на краязнаўчай выстаўцы «Край, у якім ты жывеш». Асаблівую цікавасць у наведнікаў бібліятэкі выклікаюць звесткі пра вядомага земляка, пісьменніка, аўтара шматлікіх прыродазнаўчых замалёвак Рыгора Ігнаценку.

Нарадзіўся Рыгор Канстанцінавіч 20 лістапада 1930 года ў вёсцы Вусаўка Касцюковіцкага раёна. Калі яму было чатыры гады, памёр бацька, а праз тры гады і маці. Так у сем гадоў Рыгор стаў круглым сіратою. Дзяцінства хлапчука прайшло ў дзіцячым доме «Камунары». Пісьменнік успамінае: «...Вакол стаяў лес, кожную раніцу нас будзілі птушыныя спевы, днём мы гулялі сярод такіх хвой, што трое чалавек не змаглі б іх абхапіць. Гэта асаблівыя дні ў маім жыцці...»

Калі пачалася вайна, выхаванцаў дзіцячага дома эвакуявалі. Пасля доўгіх блуканняў Рыгор апынуўся ва Узбекістане, у горадзе Шафрыкане непадалёку Бухары, дзе перанёс тыф. Тут Рыгор згубіў сваю сястру Марыю, бо іх размеркавалі па розных сем'ях, і ён не ведаў, хто ўдачарыў яе. Але лёс прывёў яго ў Паплавы, дзе жыве з 1956 года і 34 гады адпрацаваў настаўнікам у мясцовай школе, завочна скончыўшы Усесаюзны ўніверсітэт мастацтваў у Маскве.



Р. Ігнаценка

Вельмі прыцягвалі маладога настаўніка бярэзінскія лясы, рака Бярэзіна. Цікавыя сустрэчы з паляўнічымі і рыбакамі, назіранні за прыродай падштурхнулі да напісання першага апавядання. Яно было апублікаванае ў 1956 годзе ў дзіцячай газеце «Зорька», дзе ў той час працаваў ураджэнец Бярэзіншчыны, пісьменнік Яўген Курто, які цёпла паставіўся да спробаў літпачаткоўца.

Рыгор Канстанцінавіч – аўтар 10 кніг, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі, яго імя занесенае ў беларускую энцыклапедыю. Лепшыя апавяданні ўключаныя ў падручнікі для вучняў пачатковых класаў. У 1964 годзе з'явіўся першы зборнік «Лясныя тынкоўшчыкі», затым «Урок у лесе» (1965), «Ластаўчына затока» (1967), «Рабчыкі спяваюць» (1970), «На заячых сцежках» (1973), «Песня івалгі» (1998), «Зацугляны шчупак» і інш. У сваіх творах пісьменнік апявае родную прыроду, яе прыгажосць і таямніцы. Галоўная тэма – гармонія ва ўзаемаадносінах чалавека і прыроды. Жыхары Бярэзіншчыны з гонарам і любоўю называюць Р. Ігнаценку «бярэзінскім Прышвіным». Ён аўтар шматлікіх літаратурна-краязнаўчых замалёвак, якія часта друкуюцца на старонках раённай газеты «Бярэзінская панарама». Рыгор Канстанцінавіч часты госць Паплаўскай бібліятэкі. На сустрэчах з аднавяскоўцамі і вучнямі пісьменнік шчыра дзеліцца літаратурнымі здабыткамі, зачытвае ўрыўкі са сваіх кніг, расказвае цікавыя гісторыі з жыцця, раскрывае таямніцы прыроды роднага краю.

Як заўжды, цікава прайшла сустрэча з пісьменнікам-земляком на прэзентацыі яго новай кнігі «Зацугляны шчупак». На імпрэзе прысутнічалі і сталічныя госці – Алесь Карлюкевіч і Алесь Марціновіч.

Нідзе недрукаваныя тэксты замалёвак «бярэзінскага Прышвіна», якія ён даверыў Паплаўскай бібліятэцы, сталі падставай для выпуску ў 2012 годзе першага бібліятэчнага самавыдавецкага зборніка «Зялёнае рэха». Гэтае выданне ўключае 17 апавяданняў і цікавыя фотаздымкі з хатняга архіва земляка.

Сапраўдным падарункам для прыхільнікаў творчасці пісьменніка-прыродазнаўца стаў выпуск вясной 2013 г. другога самавыдавецкага зборніка – «Пад ляснымі шатамі». Выданне змяшчае 19 новых апавяданняў, кожнае з якіх гучыць узнёслым гімнам прыродзе, нашаму зялёнаму сябру лесу і яго насельнікам. Бібліятэчныя выданні Р. Ігнаценкі «Зялёнае рэха» і «Пад ляснымі шатамі» з'яўляюцца цудоўным дапаўненнем да прадстаўленых у краязнаўчым кутку Паплаўскай бібліятэкі яго друкаваных кніг і карыстаюцца павышаным попытам вяскоўцаў.

А. Марціновіч, Р. Ігнаценка і А. Карлюкевіч

Ірына СЯМАШКА,
бібліятэкар аддзела маркетынгу Бярэзінскай ЦБ

Якая роля журналістыкі ў вывучэнні гісторыі горада? Якімі крытэрыямі карыстацца журналісту пры падрыхтоўцы матэрыялаў на краязнаўчую тэму? У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А. Куляшова адказалі на гэтае пытанне. Нядаўна выйшаў падручнік Любові Дуктавай «Гісторыя Магілёва ў адлюстраванні сучасных друкаваных рэгіянальных СМІ» для студэнтаў спецыяльнасці «Журналістыка (друкаваныя СМІ)».

Краязнаўчы падручнік для студэнтаў ВНУ

Гэта навучальна-метадычны дапаможнік для аднайменнай дысцыпліны магілёўскага ўніверсітэта. Студэнты-журналісты цяпер могуць вывучаць гэты курс у восьмым семестры, пасля таго, як праслухалі курсы лекцыяў па сацыяльна-гуманітарных («Гісторыя Беларусі», «Культуралогія» і інш.), агульнапрафесійных і спецыяльных прадметах («Гісторыя беларускай журналістыкі», «Рэпарцёр службы навінаў» і г.д.).

Выданне дае магчымасць пазнаёміцца з асаблівасцямі падрыхтоўкі краязнаўчых публікацыяў у СМІ. Падручнік вучыць будучых журналістаў арыентавацца ў гістарыяграфіі розных перыядаў жыцця Магілёва. Студэнты ўдасканальваюць навыкі ды развіваюць адпаведнае мысленне. Будучы аўтар павінен працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі, ды й на семінарах студэнты карыстаюцца энцыклапедыямі, календарамі, інтэрнэтам, наведваюць музеі.

У падручнік Л. Дуктавай уваходзяць гістарычныя публікацыі, змешчаныя калісьці ў магілёўскай прэсе. Таксама навучэнцу прапануюцца практычныя і кантрольныя заданні: праца з фактычнай інфармацыяй, разгляд сістэмы аўтарскай аргументацыі ды сродкаў пераканання чытача. І, вядома, студэнты спрабуюць самастойна пісаць артыкулы.

«Гісторыя Магілёва ў адлюстраванні сучасных друкаваных рэгіянальных СМІ» прызначаецца для студэнтаў-журналістаў, але будзе карыснай і ўсім, хто цікавіцца мінуўшчынай горада на Дняпры ды жадае яе вывучаць і папулярызаваць. Цікаўныя знойдуць тут звесткі ад перыяду станаўлення старажытных беларускіх княстваў да сучаснага жыцця Магілёва.

Ігар МЫСЛІВЕЦ

Школа маладога пісьменніка абвяшчае набор

Пачынаецца другі набор навучэнцаў у Школу маладога пісьменніка пры ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» на 2013/2014 навучальны год.

Заняткі будуць праходзіць у Мінску з сярэдзіны кастрычніка па май два разы на месяц: у суботу (практычныя) і пятніцу (лекцыі і майстар-класы). Наведнікам з рэгіёнаў – спрыянне з даездам. Навучанне ў Школе – бясплатнае, група – 15–20 чалавек, выкладанне будзе весціся па-беларуску.

Школа дзейнічае як нефармальны адукацыйны праект, сертыфікат аб яе заканчэнні не замяняе дыплома афіцыйных навучальных установаў.

Умова для кандыдатаў – узрост да 25 гадоў.

Для падачы заяўкі кандыдату неабходна даслаць свой празаічны мастацкі тэкст любога жанру аб'ёмам 2–5 старонак, а таксама матывацыйны ліст з адказам на пытанне, чаму ён хоча вучыцца ў пісьменніцкай школе.

Заяўкі прымаюцца па электроннай пошце да 1 кастрычніка па адрасе sbp@lit-bel.org з пазначэннем тэмы «Школа». Прозу і матывацыйны ліст дасылайце разам у адным файле Word фармату doc. На першай старонцы пазначце сваё імя і прозвішча, поўны паштовы адрас, дату нараджэння, e-mail і кантактны нумар тэлефона.

Пры залічэнні ў Школу Вам будзе паведамлена пра гэта да пачатку заняткаў па кантактах, якія Вы пакінулі. Заяўкі не рэцэнзуюцца.

Паводле інфармацыі арганізатараў

СЛАВУТЫ АЎТАР НАРОДНАЙ ПЕСНІ

«Вясковы лірнік» – Уладзіслаў Сыракомля, да 190-годдзя з дня нараджэння

Сёння, напэўна, няма такога аматара музыкі, які не ведаў бы надта папулярнай некалі песні «Ямшчык». Але спытайце ў самых дасведчаных, чый гэта твор, і адказ будзе няпэўным. У лепшым выпадку скажуць, што гэта народная песня. І не будуць мець рацыі. Бо ў яе ёсць аўтар словаў. І зусім не рускі паэт Трэфалеў, як часам аб'яўляюць па радыё. Асоба сапраўднага аўтара самым цесным чынам звязаная з нашай зямлёй.

Людвік Кандратовіч, альбо, як найбольш яго ведаюць, Уладзіслаў Сыракомля вядомы паэт, апантаны фальклярыст, знаўца вуснай беларускай народнай творчасці, удумлівы даследчык нашага краю і ягонай даўніны.

Час яго кароткага – усяго 39 гадоў – жыцця выпаў на вельмі няпросты для беларускай гісторыі перыяд. Нарадзіўся Людвік 29 верасня 1823 года ў фальварку Смольгава цяперашняга Любанскага раёна, а памёр 15 верасня 1862 года ў Вільні і пахаваны на могілках Роса. Што ж умясцілася ў маленечкую рыску паміж дзвюма гэтымі датамі? Па мерках сусветнай гісторыі – усяго толькі імгненне. А для беларускай зямлі гэта быў адзін з драматычных перыядаў, якіх, на жаль, выпала ёй да скрушнасці шмат.

Медаль
(мастак С. Гарбунова, 1983 г.)

Калі пад націскам эканамічных, палітычных абставінаў і вызвольных памкненняў людзей розных саслоўяў, у Расіі рыхтавалася адмена прыгоннага права, то ў дачыненні да беларусаў паводзіны царскіх уладаў станавіліся ўсё больш жорсткімі. У 1832 годзе закрыты Віленскі ўніверсітэт, дзе здаўна спелілася, станавілася на крыло і беларуская думка. Імператар Мікалай I, забараніў нават саму назву «Беларусь». Замест гэтага беларускія землі з іх шматвяковай нацыянальнай гісторыяй з 1840 года займелі дзіўнае паняцце «Северо-Западный край». Адмянялася дзеянне Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года, які працяглы час лічыўся ў Еўропе прызнаным і аўтарытэтным юрыдычным дакументам. Была забароненая нават беларуская мова.

Ды беларусы не маглі змірыцца з такім становішчам, што і пацвердзіла найбольш яскрава паўстанне 1863 года пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Але гэта было ўжо без Уладзіслава Сыракомлі.

Вось у гэткіх няпростых умовах фармаваліся творчыя і грамадзянскія погляды Людвіка Кандратовіча. Ён выдатна бачыў і дасканала ведаў як жыццё багатых, уладных, уплывовых асобаў, так і тых, хто цалкам залежаў ад багацця іншых. Мо гэтаму спрыяла тое, што мусіў у пошуках і кавалка хлеба, і самога сябе часта мяняць месца жыхарства. Вёска Кудзінавічы, блізкая да Коласавай Мікалаеўшчыны Мархачоўшчына, Навагрудак, наднёманскі фальварак Залучча, Барэйкаўшчына, Вільня, Ломжа, Сувалкі, Коўна... Вось не поўны пералік месцаў побыту Сыракомлі, дзе ён бачыў тое рэальнае жыццё, якое стала пазней факталагічным матэрыялам для многіх яго твораў.

Партрэт Сыракомлі
(мастак М. Фаянс, каля 1851–1863 гг.)

Хто ж быў для беларусаў Уладзіслаў Сыракомля і кім застаўся сёння? Лірнік вясковы, як назваў яго чык, краязнаўца, вядома ж, працаваў на польскай і беларускай нівах, з'яўляўся польскім і беларускім паэтам. Вершы і літаратурныя творы ствараў большасцю на польскай мове, хоць зместам сваім ці не ўсе яны знітаваныя з беларускімі рэаліямі.

Аднак і сам ён таксама пісаў па-беларуску. Ды, на жаль, такіх твораў захавалася мала. Праўда, калі сябар і памочнік Сыракомлі, таксама слынны беларускі і польскі паэт і публіцыст Вінцэсь Каратынскі рыхтаваў збор ягоных твораў, то меў намер уключыць туды і напісанае на беларускай мове. Але намеру не суджана было здзейсніцца. Як не рэалізавалася яшчэ адна найцікавая задума выдаць сумесны зборнік беларускіх вершаў. Чаму? Акрамя ўсяго адказ хаваецца і ў тым, што беларусам у Расійскай Імперыі забаранялася друкаваць свае творы кірыліцай.

Дык жа Людвік Кандратовіч стаў Уладзіславам Сыракомлем? У гэтым «вінаватая» паэзія, да якой прыгарнулася юная душа...

Гандлёвая плошча Міра заўсёды была шматлюднай. Тут любіў збірацца народ з блізкіх і далёкіх ваколіцаў. Найлепшым месцам для сустрэчаў, вядома ж, была карчма. Менавіта тут і пачуў малады Людвік шчымлівы аповед падпітага мужчыны пра трагічнае каханне. Адзін вазніца-паштар мусіў тэрмінова даставіць пакет адрасату. З-за гэтага ён не мог дапамагчы сваёй каханай. Дзяўчына замерзла ў глыбокім снезе пад сцюдзёным месяцам.

Усхваляваны пачутым, дваццацігадовы Людвік вярнуўся ў наднёманскі фальварак і напісаў сваю першую гавэнду альбо гутарку – «Паштальён». Гэтае паэтычнае апавяданне было надрукаванае ў 1844 годзе ў віленскім часопісе «Атэнэум». Яго ўбачыў сучаснік Кандратовіча рускі паэт Леанід Трэфалеў. Яму перадаўся ўзрушаны настрой аўтара і ён пераклаў урывак гавэнды на рускую мову. А неўзабаве пераклад быў пакладзены на музыку і стаў народнай песняй «Ямщик».

Так і жыве ўжо больш за паўтара стагоддзя гэтая папулярная песня то як народная, то як аўтарскі твор Леаніда Трэфалева. І толькі самыя абазнаныя ў творчасці Уладзіслава Сыракомлі могуць з пэўнасцю сказаць, хто сапраўдны аўтар «Паштальёна». Давайце і мы назаўсёды запомнім гэтае слыннае імя – Уладзіслаў Сыракомля.

Анатоль БУТЭВІЧ

(Заканчэнне ў наступным нумары)

Наш каляндар

Беларуская паэтка **Наталля АРСЕННЕВА**, чый 110-гадовы юбілей мы адзначылі 20 верасня, нарадзілася ў горадзе Баку (што тады належаў да Расійскай Імперыі), паходзіць з тых Арсенневых, якія па жаночай лініі далі рускага пісьменніка Міхаіла Лермантава. Але лёс склаўся так, што яна, руская па нараджэнні, стала класікам беларускай літаратуры.

Адбылося тое ў далёкім 1919 годзе. Вось як аб тым паэтка ўзгадвала ў 1990-м: «Вяртаючыся з бежанства (з Вільні. – **«КГ»**), мы столькі перажылі... Часта траплялі пад перастрэлку. Было небяспечна. Знайшлі тады прытулак у вёсцы Жоўніна. Нанялі хату. Там і перазімавалі. Тут я ўпершыню, можна сказаць, пачула жывую беларускую мову. Гаспадары – Хвядосся і Юрка – сварыліся: "Чакай, чакай, я ўжо табе юшку пушчу!" Гэтак смачна, каларытна гучала беларускае слова. Любілі слухаць экспрэсіўную гаворку гаспадароў...».

Пісьменнік Сяргей Панізьнік і мясцовыя краязнаўцы расшукалі звесткі пра людзей, у якіх зімавалі Арсенневы. Яшчэ напрыканцы 1990-х у Верхнядзвінскім раёне жылі бабулькі, якія памяталі Хвядоссю і Юрку, – Марыя Аляксандраўна Несцерава і Галіна Кузьмінічна Малаток. Яны і распавялі, што былі то сціплыя, вялікай душы і шчырага сэрца асобы. Жылі ў невялікай нізенькай хатцы на пагорку пасярод вёскі; мелі гаспадарку, кавалак зямлі, сад. Сваіх дзяцей не мелі, таму ўсю сваю пяшчоту аддавалі асірацелай пляменніцы. Увогуле, яны вельмі любілі малых, таму ў святочныя дні іх хата поўнілася дзіцячымі галасамі. Гаспадыня была вельмі набожнаю; гатавала надзвычай смачную бульбу і гушчу. Юрка ж быў ад нараджэння глухім.

Н. Арсеннева – студэнтка Беларускіх курсаў у Вільні, 1921 г. (БДАМЛіМ)

Супрацоўніца Верхнядзвінскай ЦРБ Ніна Глацёнак у раённай газеце «Дзвінская праўда» дзесяць гадоў таму адзначала, што «пасля іх смерці прайшло шмат часу, але ацалела і даглядаецца магіла Хвядоссі, збярогся і яе сямейны архіў. Фота гэтай цікавай жанчыны зберагаецца для мемарыяльнага куточка Наталлі Арсенневай у Жоўнінскай сельскай бібліятэцы. А хата, дзе зімавала Н. Арсеннева той далёкай парою, перасыпаная, абкладзеная цэглай.

З нагоды 100-гадовага юбілею паэткі ў Жоўніне праходзіла вечарына, прысвечаная аўтару хрысціянскага гімна «Магутны Божа». Пасля ў раённай газеце кіраўнік клуба цікавых сустрэчаў пры раённай бібліятэцы Людміла Гагалінская паведамляла, што імпрэза пачалася з экскурсіі па вёсцы, а потым слова мелі бібліятэкары, краязнаўца Антон Бубала, пісьменнік С. Панізьнік ды іншыя, гучалі песні на вершы паэткі.

Мінула 10 гадоў. За гэты час можна было б раённым уладам парупіцца, каб неяк увекавечыць імя слыннай літаратаркі, а таксама добрым словам згадаць і шчырых людзей, якія прывялі маленькую Наталлю да беларускай культуры. Узгадваючы выдатных, не грэх памятаць і пра тых «простых», хто незаўважна жыве ды ўздзейнічае свамі ўчынкамі на творчыя лёсы, на лёсы сваіх землякоў. Мы ж сёння прапануем чытачам нашай газеты архіўныя фота (копіі, якія ласкава прадаставіў С. Панізьнік) людзей, якія спрычыніліся да лёсу Н. Арсенневай.


Хвядосся

Злева – Юрка і Хвядосся

Падрыхтаваў Лявон ПАЛЬСКІ

З чаго пачыналася беларусазнаўства

У ліпені 1918 г. у Маскве Беларускае навукова-культурнае таварыства пачало займацца пытаннямі беларусазнаўства. Але чаму менаміта тут, а не ў Беларусі? Справа ў тым, што ў той час становішча ў нашым краі было вельмі складаным: у лютым нямецкія войскі акупавалі амаль усю краіну.

У Савецкай Расіі актыўна працавалі над стварэннем Беларускай Савецкай Рэспублікі, а падштурхнула да гэтых дзеянняў «Декларация прав трудящихся и эксплуатируемого народа». У канцы студзеня – пачатку лютага 1918-га ў Петраградзе быў створаны Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам) на чале з А. Чарвяковым, які ў сакавіку гэтага года пераехаў у Маскву. Хутка былі створаныя і аддзяленні Белнацкама ў Петраградзе, Смаленску, Віцебску, а таксама аддзяленні спецыяльных прадстаўнікоўэмісараў у Арле, Калузе, Оршы, Самары, Саратаве, Сімбірску, Тамбове і іншых гарадах Расіі.

На пачатку працы патрабавалася вызначыць памеры тэрыторыі, заселенай этнічнымі беларусамі. Найбуйнейшы беларусазнаўца таго часу Я. Карскі яшчэ ў 1903 г. выдаў этнаграфічную карту, якую адразу ж раздрукавалі ў 1917-м, але на той момант яна ўжо не адпавядала патрабаванням, хаця б таму, што гэта была карта «племені». А вось што датычылася гісторыі беларускага народа, то яе яшчэ трэба было напісаць. Гэтую задачу і ўзяло на сябе Беларускае навукова-культурнае таварыства, чальцамі якога былі У. Пічэта, М. Янчук, Д. Канавалаў, В. Качалаў і іншыя, а ганаровымі сябрамі – Я. Карскі, М. Любаўскі, П. Жуковіч, М. Доўнар-Запольскі і А. Сапуноў. Ці ледзь не адзіным помнікам дзейнасці гэтай арганізацыі з'яўляецца невялікая брашура (23 старонкі невялікага фармату), якая ўтрымлівае даклад М. Любаўскага «Основные моменты истории Белоруссии», прачытаны на першым публічным пасяджэнні таварыства 14 ліпеня 1918 г. У прадмове да брашуры змешчанае паведамленне пра арганізацыю таварыства і яго склад, напісанае Ф. Туруком.

Спецыяліст па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага да 1569 г. М. Любаўскі ў сваім дакладзе таксама значную частку прысвяціў ранняму перыяду гісторыі Беларусі. Асноўная ідэя заключалася ў тым, што Беларусь на працягу сваёй гісторыі аддавала ўласныя інтэлектуальныя (і іншыя) сілы на карысць суседніх народаў: літоўцаў, украінцаў, рускіх. Што датычыцца палякаў, то пра іх зусім не згадваецца. Асабліва шмат беларусы далі Літве. «*В русской общественности,* – піша Любаўскі, – *литовские князья* (маецца на ўвазе першапачатковы перыяд утварэння Літоўскай дзяржавы. – **В.А.**), *по всем признакам, могли почерпать более сил и средств для утверждения государственности, чем в общественности литовской*». «*Русь* (Беларусь. – **«КГ»**) *давала,* – піша ён далей, – *в их* (літоўскіх князей. – **В.А.**) *распоряжение военный люд, по военной выправке и храбрости не уступавший западному рыцарству*». Пры больш высокім, у параўнанні з Літвой, грамадска-эканамічным развіцці Беларусі «литовские князья для утверждения государственности старались почерпать политические силы и средства именно в присоединённой к Литве Руси, откуда брали воинов и должностных лиц, переносили на Литву тамошние порядки и установления, русский (беларускі. – **«КГ»**) официальный язык» і г.д.

Як і іншыя даследчыкі таго часу, Любаўскі моцна перабольшвае паланізацыю Беларусі. Ён лічыў, што пасля 1569 г. апалячылася не толькі шляхта, але «отчасти и состоятельное мещанство» найбольш буйных гарадоў Беларусі (Полацк і Віцебск). Любаўскі сцвярджаў: «*Всё, что было сознательного, развитого и культурного в Белоруссии, стало или становилось польским. Край в значительной степени утратил свой русский характер и приобрёл характер польский*». Нам жа вядома, што калі магнаты, шляхта і мяшчанства прынялі польскае адзенне, і афіцыйнай моваю стала польская, то беларуская мова ўтрымалася як жывая, размоўная ў асноўнай масы насельніцтва.

Заключная частка дакладу прысвечаная «рускому периоду», калі Беларусь увайшла ў склад Рускай дзяржавы. Тут Любаўскі даволі рэзка крытыкуе царскі ўрад за ліквідацыю царкоўнай уніі самымі грубымі сродкамі. Памылкай ён таксама лічыў і тое, што земствы ў Беларусі былі ўведзеныя з вялікім спазненнем – у 1911 г., ды не цалкам, і не паўсюль: зусім не ўводзіліся яны ў заходняй Беларусі.

Амаль у той жа час, калі праводзілася першае пасяджэнне Беларускага навукова-культурнага таварыства, у Маскве пачаў працаваць першы Беларускі народны ўніверсітэт, арганізаваны культурна-асветніцкім аддзяленнем Беларускага нацыянальнага камісарыята з мэтай даць слухачам звесткі па беларускай гісторыі, літаратуры, мове, эканоміцы, геаграфіі і іншых дысцыплінах. Займаліся тут 57 чалавек, у асноўным прадстаўнікі народнай асветы і культурна-асветніцкіх арганізацыяў Беларусі.

Мяркуючы па лекцыях, што чыталіся ва ўніверсітэце і былі часткова надрукаваныя, Любаўскі ўдзелу ў працы ўстановы не прымаў. Магчыма, галоўным дзеячам там лічылі У. Пічэту. Гэтыя лекцыі пазней былі надрукаваныя асобнай кнігай пад назваю «Курс белорусоведения» (Москва, 1918–1920). Змест курса наступны: Ф. Турук «Прадмова»; У. Пічэта «Гісторыя беларускага народа»; Д. Анучын «Да пытання пра беларускую тэрыторыю»; М. Сіменіч «Геаграфічны нарыс Беларусі»; А. Фартунатаў «З сельскагаспадарчай статыстыкі пяці беларускіх губерняў»; Я. Чапуркоўскі «Антрапалогія беларусаў»; М. Янчук «Этнаграфічны нарыс Беларусі»; П. Растаргуеў «Беларуская мова ў яе сучасным і мінулым стане»; З. Жылуновіч «Беларуская літаратура»; М. Сілішчанскі «Да пытання па методыцы радзімазнаўства»; Я. Карскі «Этнаграфічная карта беларускага племені».

У прадмове Ф. Турук адзначыў, што ў зборнік не ўвайшлі некаторыя лекцыі (аўтары ім не названыя): «Земляробства ў Беларусі»; «Лесаводства ў Беларусі»; «Кааперацыя ў Беларусі»; «З гісторыі нацыянальна-рэвалюцыйнага руху ў Беларусі»; «Гісторыя адукацыі ў Беларусі»; «Элементы тэатра ў беларускай нацыянальнай паэзіі»; «Этнаграфічны нарыс пра Беларусь».

Дарэчы, этнаграфічны нарыс быў змешчаны ў «Курсе», аўтарам яго быў М. Янчук. Відавочна, першапачаткова ён быў напісаны Я. Карскім, але чаму яго замянілі іншым, Ф. Турук не паведамляе.

Трэба адзначыць, што найважнейшым заставалася пытанне: якую тэрыторыю варта прызнаць беларускай? Даволі працяглы час пасля далучэння Беларусі да Расійскай Імперыі Беларуссю называлі толькі Віцебскую і Магілёўскую губерні. У другой палове XIX ст. да іх сталі адносіць яшчэ Мінскую і Смаленскую. У шэрагу працаў, што пабачылі свет пад рэдакцыяй П. Сямёнава-Цянь-Шанскага, беларускімі называлі Магілёўскую, Віцебскую, Мінскую і Смаленскую, а Віленскую, Гродзенскую і Ковенскую – літоўскімі, хаця большасці аўтарам было вядома, што ў Гродзенскай губерні літоўцаў амаль зусім не было, а ў Віленскай літоўскае насельніцтва знаходзілася толькі ў заходняй частцы; а вось паўночна-заходняя частка Віцебскай заселеная латышамі і г.д.

Лекцыю пра тэрыторыю Беларусі прачытаў акадэмік Д. Анучын. Вельмі характэрна, што даклад ён пачаў з пытання аб магчымасці ўтварэння самастойнай беларускай дзяржавы, вось толькі меркаванне па гэтай праблеме выказвалася ў вельмі туманнай форме. Так, Анучын сказаў: «*Нельзя, например, пользоваться данными истории, потому что данные эти противоречивы, и если одни из них говорят в пользу несомненных прав Белоруссии на национально-политическую самостоятельность, то другие, напротив того, могут служить доказательством традиционной зависимости Белоруссии от Литвы, Польши, Великороссии*». Як і іншыя аўтары працаў «Курса», Анучын лічыў беларусаў не народам, не нацыяй, а племенем. А пра вобласць, якую ён лічыць беларускай, нічога не сказаў. І. Сілініч, аўтар геаграфічнага нарыса, сцвярджаў, што беларускімі «разумеют» губерні Смаленскую, Магілёўскую, Мінскую і Віцебскую, а А. Фартунатаў да беларускіх аднёс Мінскую, Магілёўскую, Віцебскую, Віленскую і Гродзенскую губерні.

Зусім іншую пазіцыю заняў У. Пічэта. Яго лекцыя мае назву «Гісторыя беларускага народа». Значыць, Уладзімір Іванавіч адразу адмовіўся ад «племені», што мела прынцыповае значэнне. Новым у яго працы было і тое, што ён распавядаў гісторыю Беларусі ад старажытных часоў да пачатку XX ст. уключна. Яна напісаная на падмурку літаратуры і апублікаваных крыніцаў, якія існавалі на той час. Новыя архіўныя матэрыялы не выкарыстоўваліся, таму што на падрыхтоўку «Курса» было даволі мала часу. «Гісторыя» У. Пічэты падзеленая на 20 параграфаў, вельмі розных па памеры. З прапанаванага ў канцы артыкула бібліяграфічнага спіса бачна, што пры напісанні працы былі выкарыстаныя 63 публікацыі і навуковыя артыкулы, у тым ліку і шэраг серыйных археаграфічных выданняў.

Напісаная на хуткую руку ў першы год пасля рэвалюцыі «Гісторыя» мела навукова-папулярны характар. Сёння яна выклікае цікаўнасць толькі ў гістарыяграфічным плане. Добра бачныя яе недахопы нават для таго часу. У спісе выкарыстаных крыніцаў, напрыклад, адсутнічаюць такія даследаванні, як першы том «Белоруссов» Я. Карскага і працы афіцэраў Генеральнага штаба П. Баброўскага, І. Зяленскага і А. Карэвы, што ўтрымліваюць апісанні Гродзенскай, Мінскай і Віленскай губерняў па стане на пачатак 1860-х гг.

Асобныя раздзелы «Гісторыі» дрэнна звязаныя паміж сабой, увогуле, гэта асобныя нарысы. У працы цалкам адсутнічаюць дадзеныя пра класавую барацьбу. Нават у раздзеле X, дзе каротка расказваецца пра вайну 1654–1667 гг. паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай, пра выступленні сялянаў і гарадскіх нізоў супраць феадалаў аўтар нічога не кажа. У. Пічэта каротка ўзгадвае пра паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, пра паўстанне 1830 г., але ні слова не кажа пра падзеі 1863 г., пра рэвалюцыю 1905–1907 гг. Можна адзначыць і яшчэ шэраг недакладнасцяў. Але «Гісторыю» У. Пічэты трэба ацэньваць не з пункту гледжання нашага часу, а з першых гадоў рэвалюцыі. У той час гэта была адзіная праца, дзе паказаная гісторыя народа за больш чым тысячагадовы перыяд. Тым больш, гісторыя «народа», і гэта мела вялікае значэнне.

«Гісторыя» была разлічаная на масавага чытача, і яе насамрэч чыталі і вывучалі розныя людзі. Але было тое, што аб'ядноўвала іх: усе чыталі гісторыю свайго народа ўпершыню. У гэтым і ёсць яе каштоўнасць.

Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ

Кастусь Каліноўскі

Толькі гутарка ходзіць такая...
Янка Купала

Кастусь Каліноўскі стаў нацыянальным героем Беларусі, хаця ў яго мелася ўсё для таго, што прыводзіла іншых да здрады Радзіме. Ён не пайшоў па шырокай дарозе выратавання і прыстасавання, добра ўтаптанай многімі пакаленнямі рэнегатаў, а стаў самаахвярна пракладваць поўны трагічных небяспек шлях нацыянальнага вызвалення. Перспектыву бліскучай кар'еры і раскошнага жыцця высокапастаўленага чыноўніка Кастусь Каліноўскі без хістанняў прамяняў на кіпучае жыццё рэвалюцыянера і шыбеніцу. Ён меў шляхецкае званне, але быў вядомы народу пад мужыцкім імем Яські Гаспадара.

Высокая адукацыя, якая для многіх з'яўлялася самай надзейнай сцяной, што адгароджвала іх ад свайго цёмнага народа, для Кастуся Каліноўскага была адным з тых мастоў, па якім ён прыйшоў у стан барацьбітоў за сваю Радзіму. Для многіх «сыноў» Беларусі вырачэнне роднай мовы было іх першым крокам у здрадзе бацькаўшчыне. Для Кастуся ж вернасць роднай мове была паролем вернасці Беларусі. Ён добра бачыў, што беларуская мова была не толькі нацыянальнай, але і класавай адзнакай яго мужыцкага народа, і ён не мог уявіць уздым роднай старонкі без пазбаўлення ад прыніжэння роднай мовы. Калі да яго на гэтай мове пісалі толькі літаратурныя творы, то Кастусь Каліноўскі ўзвёў ужыванне яе ў ранг вялікай нацыянальнай справы і шматграннай дзяржаўнай дзейнасці. На ёй ён вучыў народ сваёй «Мужыцкай праўдай», на ёй аддаваў загады сваім паўстанцам, на ёй пісаў свой запавет народу – «Лісты з-пад шыбеніцы».

Беларускі народ меў слаўную тысячагадовую гісторыю. Ён жыў у самым цэнтры Еўропы. Але акружаныя з усіх бакоў і задушаныя бязлітаснымі ворагамі, якія рабавалі іх багацці, разбуралі іх нацыянальнае жыццё, аплёўвалі іх культуру і абкрадвалі іх мінулае, беларусы былі малавядомым народам. Значэнне Кастуся Каліноўскага найперш і заключалася ў тым, што ён вывеў свой народ з цемры нацыянальнай невядомасці і гэтым самым паказаў свету новую краіну – сваю родную Беларусь. Гэтым вялікім рэвалюцыйным адкрыццём Беларусі і было паўстанне 1863 года, правадыром якога стаў Кастусь Каліноўскі. Беларускае паўстанне мела свае мэты, процілеглыя мэтам польскага паўстання, якое адбывалася адначасова, гэтаксама як і сам Кастусь быў поўнай процілегласцю польскім рэвалюцыянерам і ў Польшчы, і ў Беларусі. Калі яны былі містыкамі, то ён быў рэалістам. Яны бачылі шляхецкую Польшчу, ён бачыў мужыцкую Беларусь. Іх ідэал быў у мінулай Польшчы са шляхецкімі вольнасцямі, яго ідэал – у будучай Беларусі з народнай воляй.

У Кастусю Каліноўскім як бы абудзілася энергія нашых славутых продкаў – грозных палачанаў. Пасля легендарнага полацкага князя Усяслава Чарадзея ён быў самым выдатным правадыром Беларусі.

Кастусь Каліноўскі глыбока разумеў, што беларускаму народу больш чым якому патрэбная незалежнасць, бо ён быў самым зняволеным, самым прыніжаным і самым забітым народам Расійскай Імперыі. Каліноўскі быў і першым вяшчальнікам самастойнай Беларускай рэспублікі, і першым, хто распачаў будаваць яе. Чырвоны Жонд, які ўзначальваў Каліноўскі, быў першым і пакуль што адзіным сапраўдным Беларускім урадам.

Сярод многіх ворагаў Беларусі ён бачыў і галоўнага: ужо з-пад шыбеніцы вялікі сын напомніў свайму народу, што «як дзень з ноччу не сходзіць разам, так і навука праўдзіва не йдзе разам з няволяй маскоўскай. А пакуль яна ў нас будзе – у нас нічога не будзе. Не будзе праўды, багацця і ніякай навукі, адно намі, як скацінай варочаць будуць не для дабра, адно на пагібель нашу... тагды толькі зажывеш шчасліва, калі над Табою маскаля ўжо не будзе». Гэтыя словы сёння гучаць яшчэ з большай сілай, чым сто гадоў таму.

Кат узвёў Кастуся Каліноўскага на эшафот, а гісторыя паставіла яго на высокі п'едэстал нязломнай рэвалюцыйнай мужнасці і бязмежнай адданасці Радзіме.

Мікола ЕРМАЛОВІЧ
1993 г.

Землякі ў свеце

«Дарога» Вячаслава Ігнаценка

Усё коцяцца ды коцяцца кудысьці калёсы з каменнаю стэлай, а неба на захадзе зарасло дзівоснай палявою травой. Над дрымотнаю вёскай ляціць улагоджаны анёл, і дзесьці вельмі далёка над векавымі гарамі ў мяккіх аблоках завяла сваю чароўную музыку нябесная скрыпка... Побач вясковая хата размясцілася на кавалку сапраўднага жоўтага сялянскага масла (такое калісьці рабіла і мая бабуля) ды ганарліва сядзіць на ім. Спакойна пасвяцца коні па васільковым полі, а за плячыма нечы выразны погляд працінае цябе, нібы кажа: «Вось дык сустрэча!» У Малдове людзі кажуць: «Ваш беларускі мастак Вячаслаў Ігнаценка заўсёды поўны творчых ідэяў».

Не паспелі забыцца выдатныя геаметрычныя каляровыя кампазіцыі і графіка на персанальнай выстаўцы майстра «Калейдаскоп», што ў ліпені праходзіла ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, а тут новы гучны вернісаж «Дарога», і ўжо ў Кішынёве.

На гэты раз гасцінным домам для амаль 30 працаў мастака стала Бюро міжэтнічных адносінаў, што размяшчаецца ў цэнтры Кішынёва і працуе пры Урадзе Рэспублікі Малдова. Выстаўка амаль увесь верасень радавала наведнікаў дзівоснымі фантазійнымі творамі мастака.

І нядзіўна, што менавіта нашаму земляку Вячаславу Міхайлавічу Бюро прапанавала такую ганаровую магчымасць арганізаваць і правесці персанальную выстаўку, прысвечаную Дню Незалежнасці Рэспублікі Малдова. Талент і досвед у мастака велізарны, і хто як ні ён зможа найлепшым чынам шматгранна прадставіць і сваю родную Беларусь, і другую Радзіму – Малдову. Вячаслаў Міхайлавіч ужо шмат гадоў сябра Саюза мастакоў Малдовы, сябра Міжнароднай асацыяцыі мастакоў, пастаянны ўдзельнік міжнародных пленэраў. Працы мастака знаходзяцца ў калекцыях многіх музеяў Беларусі, Малдовы і Украіны, а таксама ў прыватных беларускіх і замежных калекцыях.

В. Ігнаценка працуе ў розных відах і жанрах выяўленчага мастацтва. Палітра яго твораў вельмі разнастайная: жывапіс і графіка, геаметрычныя каляровыя кампазіцыі, малюнкі, пейзажы, нацюрморты, партрэты, а таксама побытавы, батальны і анімалістычны жанры. На гэты раз на выстаўцы «Дарога» былі прадстаўленыя вельмі цікавыя абстрактныя працы майстра і кранальныя пейзажныя творы ў рэалістычным стылі, зробленыя ў розныя творчыя перыяды.

В. Ігнаценка

Вернісаж мастака сабраў вялікую аўдыторыю. Тут можна было сустрэць дэлегатаў розных дыпламатычных місіяў, творчую эліту, сяброў розных этнакультурных дыяспараў Малдовы. І, вядома ж, нашых землякоў.

З урачыстым словам на вернісажы выступілі генеральны дырэктар Бюро міжэтнічных адносінаў Алена Белякова, Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова Вячаслаў Асіпенка, старшыня беларускай грамады ў Малдове Юрый Статкевіч. Выступоўцы не скупіліся на заслужаныя словы пахвалы, падкрэслівалі значнасць укладу сапраўднага мастацтва ва ўмацаванне двухбаковых адносінаў паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Малдова, што, безумоўна, вельмі эмацыйна кранула майстра.

Нечаканым фіналам вернісажу стаў прыемны і шчодры сюрпрыз у гонар Дня Незалежнасці Рэспублікі Малдова. Выдатная карціна В. Ігнаценкі паднесеная ў дар Бюро Ганнай Бабінай, генеральным дырэктарам дылерскага прадстаўніцтва завода «Керамін» у Малдове.

Варта адзначыць, што назва выстаўкі «Дарога» для майстра мае сапраўды вельмі сімвалічнае значэнне. Наступны год для мастака – юбілейны, не толькі ў сэнсе ўзросту, але і ў сэнсе творчага шляху. Так што хоць Вячаслаў Міхайлавіч і не любіць нешта прымяркоўваць да юбілеяў, такую доўгую і шырокую дарогу майстра сваёй справы, творчы шлях, поўны любові да роднай зямлі, бясконцых творчых ідэяў, магчымасцяў і паспяховых рэалізацыяў будзе складана абысці бокам.

Ганна МАЗУР,
кіраўнік беларускай нядзельнай школы ў Кішынёве, намеснік старшыні беларускай грамады ў Малдове

«Дарога»

«З дзяцінства»



«Раніца»

Дзве іпастасі Галіны Загурскай

Магчымасць адпачыць душой дае навапалачанам выстаўка жывапісу таленавітай полацкай мастачкі Галіны Загурскай «Мае краявіды», што экспануецца ў бібліятэцы імя Якуба Коласа.

На палотнах Галіна Пятроўна ўвасобіла мясціны сваёй любай Віцебшчыны, мястэчка Лявонпаль, што на Мёршчыне, і Полаччыну, якая стала для яе роднай. На выстаўцы прадстаўленыя пейзажы, напісаныя алеем, некалькі акварэльных і пастэльных працаў.

Гэта ўжо восьмая персанальная выстаўка мастачкі, раней яе працы экспанаваліся ў Полацку, Наваполацку, Віцебску. Галіна Пятроўна – дыпламант абласной выстаўкі «Інсіта – 2012», а Арт-цэнтр Марка Шагала набыў яе карціну «Балотца ў лесе» для сваіх фондаў. У кнізе «Народныя майстры і мастакі Віцебшчыны» (Віцебск, 2011) Галіне Загурскай прысвечаны асобны артыкул, і там жа змешчаная рэпрадукцыя яе карціны «Сад увосень».

Захапленне ў наведнікаў выстаўкі выклікаюць карціны «Лясное возерка», «Полацк восеньскі», «Сутонне». Напісаны пастэллю твор «Паводка» нават называюць маленькім шэдэўрам. А перад карцінай «Дарога да храма» хочацца затрымацца як надаўжэй. На ёй дарога ідзе ўгору, а храм паказаўся толькі напалову: мабыць таму, што мы яшчэ толькі набліжаемся да яго, недасканалыя ў духоўным сэнсе.

Галіна Загурская заняла выяўленчым мастацтвам пасля таго, як завяршыла сваю прафесійную педагагічную дзейнасць (у 1967 годзе яна з адзнакай скончыла фізмат Віцебскага педінстытута і працавала выкладчыкам матэматыкі і фізікі, метадыстам). У 2012 годзе Галіна Пятроўна пачала ўдасканальваць сваю мастацкую тэхніку ў народным клубе самадзейных мастакоў «Белый холст» Полацкага гарадскога палаца культуры. Паводле словаў кіраўніка клуба Наталлі Рудой, *«аўтар знаходзіць і перадае на палатне нешта такое, што аказвае магічнае ўздзеянне, выклікае хвалю эмоцыяў і асацыяцыяў. Усё напоўненае жыццёвай праўдай і паэзіяй»*.

«На ўскрайку Полацка»

І гэта невыпадкова, бо яшчэ адна іпастась, у якой выявіўся талент Г. Загурскай, – паэзія. Пра гэта сведчаць яе паэтычныя зборнікі «З далоняў сэрца» (2007) і «Да зямлі прытуліцца» (2009). Рыхтуецца да друку трэцяя кніга паэтэсы. Яе вершы можна ўбачыць на старонках часопісаў «Полымя», «Маладосць», газеты «Літаратура і мастацтва» і іншых. Яна сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі і рэдактар полацкага народнага літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне».

Пра жыццёвы і творчы шлях Галіны Пятроўны расказвае кніжная выстаўка, названая па загалоўку аднаго з яе вершаў, – «Прытулак для душы». Глыбокія па змесце і адштукаваныя па форме творы паэтэсы даюць магчымасць адпачыць душою. Як, напрыклад, верш «Хораша...»:

Прачнуцца летам
спазаранку,
Каб туманы прылашчыць
зрокам;
Праводзіць у блакіт
заранку
І дзень сустрэць
бадзёрым крокам;
Паслухаць птушак
шчабятанне –
Бор поўніцца
рознагалоссем;
Зямлі прыняць
любоў-прызнанне,
Што шэпча нам жытоў
калоссе...

Мікалай Балдоўскі, старшыня аб'яднання «Наддзвінне», у прадмове да кнігі «З далоняў сэрца» пісаў: *«Галіна Загурская чуе і бачыць сюжэт, яна ўмее працаваць са словам як паэтэса і гэтак жа ўпэўнена абыходзіцца з пэндзлем як мастачка. Гэтая гармонія паэтычнага ўспрымання, творчага тандэма выразна ўвасабляецца ў яе карцінах і ў вершаваных творах»*.

Валянціна СОПІКАВА,
бібліёграф бібліятэкі
імя Якуба Коласа
г. Наваполацка
Фота з архіва
Галіны ЗАГУРСКАЙ

«Пахне восень бульбаю»

Уздоўж

1. «... ў гумно накладала, // Бульбу сыпала ў мяхі» («Восень», І. Багдановіч). **5**. «І на Дзяды таксама ... елі» («Чышчу бульбу», Р. Барадулін). **8**. Адзінка падліку пісчай паперы. **10**. Папрокі, выказаныя каму-небудзь. **11**. Атрутны плод бульбы дыяметрам 2 см; яго сяляне ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. памылкова ўжывалі ў ежу, атручваліся, з-за чаго далі назву бульбе «чортаў яблык». **12**. Сярэдняранні гатунак бульбы. **15**. Свята заканчэння ўборкі зернявых (21 верасня). **16**. «Мілей мне "кнігаўка", чым "чыбіс", // Бо ... кнігаўкі ў душы. // І бульбу смажаную чыпсам // Ты зваць па модзе не спяшы» («А мову ледзь не затапталі», П. Панчанка). **17**. Пасеяўшы – хоць ..., а не сеяўшы – ні снапа (прык.). **18.** «Літары ў ... – як бульба ў разору – лягуць» («Літары ...», К. Цыбульскі). **19**. Бамбукавы мядзведзь. **20**. Прыстасаванне, дзе распальваюць агонь. **22**. На ўборцы ... праваронiш – годам не дагоніш (прык.). **23**. Час уборкі збожжавых культураў. **28**. Сярэдняпозні гатунак бульбы. **30**. «Ешце, ... залатыя дранікі – // Упадзе гадоў дзясятак з плеч» («Беларуская гасціннасць», Н. Аксёнчык). **31**. Царкоўнае песнапенне ў пахвалу свята або святога. **32**. «... нашае Мальвінкі // Абіраюць бульбу жвава» («Працавітая дзяўчынка», А. Дзяркач). **33**. Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр, дзе летась адбыўся Першы фестываль бульбы. **34**. «Беларускай бульбе слава // Ходзіць шумна з краю ў край, // Бульбе ... мы паставім // У наш першы мірны май» («Бульба», В. Голуб).

Упоперак

2. «... у нас заўсёды смачны, // Але дранік – найсмачней» («Дранікі», М. Гец). **3**. «І было, як неба, возера шырокае, // Шумела там заўсёды ...» («Дзед і шчупак», Максім Танк). **4**. Раніца. **5**. Мінеральнае рэчыва, на якое, як і на крухмал, багатая бульба. **6**. «Мой ..., мой рай бульбяна-жытны! // Зеленадолы, залаты!» («Родныя дзеці», Н. Гілевіч). **7**. Калі ... ёсць, мужыку не пост (прык.). **9**. «Сушыць яго сонца, // Хіліць вецярок. // Ные сірацінка, // Плача ...» («Жытні колас», Якуб Колас). **13**. «Печаў усіх ... – // Бульба плыве ў чыгунку» («Дома», С. Законнікаў). **14**. Рэгіён на Віцебшчыне, які ў XIX ст. славіўся высокімі ўраджаямі і добрай якасцю бульбы. **19**. Бульба – хлебу ... (прык.). **21**. «Пахне ... бульбаю, // Кмінам і цыбуляю» («У гасцях», П. Панчанка). **24**. Горны масіў у Еўропе. **25**. «Была ў іх ... і драчона, // І парасяціна смажона» («Энеіда навыварат», В. Равінскі).



26. Марская жывёліна, якая не мяняе свайго месцазнаходжання. **27**. Кармушка для жывёлы. **29**. Індзейцы Паўднёвай Амерыкі, якія з незапамятных часоў вырошчвалі бульбу і абагаўлялі яе.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ

Кастрычнік

1 – Алесь Змагар (сапр. Аляксандр Хведаравіч Яцэвіч: 1903, Слуцкі р-н – 1995), беларускі паэт, празаік, драматург, перакладчык, публіцыст – 110 гадоў з дня нараджэння.

2 – Гарадзельская ўнія (1413), саюз Вялікага Княства Літоўскага з Каралеўствам Польскім — 600 гадоў з часу юрыдычнага замацавання.

4 – Харламаў Іван Пятровіч (1928, Расія – 2007), беларускі мастак-дызайнер, графік – 85 гадоў з дня нараджэння.

5 – Казімір (Святы Казімір; 1458–1484), дзяржаўны і рэлігійны дзеяч ВКЛ, беларускі каталіцкі святы — 555 гадоў з дня нараджэння.

6 – Кузняцоў Мікалай Васільевіч (1938), вучоны-гісторык, даследчык пытанняў гісторыі і паліталогіі Беларусі, паэтлірык — 75 гадоў з дня нараджэння.

6 – Алесь (Аляксандр Макаравіч) **Мілюць** (1908, Карэліцкі р-н – 1944), беларускі паэт – 105 гадоў з дня нараджэння.

7 – Насовіч Іван Іванавіч (1788, Чавускі р-н – 1877), мовазнаўца-лексікограф, фальклярыст, этнограф, складальнік першага гістарычнага слоўніка беларускай мовы – 225 гадоў з дня нараджэння.

7 – Валянцін Блакіт (сапр. Валянцін Уладзіміравіч Болтач; 1938, Шчучынскі р-н – 2007), пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Вожык» (1987–2000) – 75 гадоў з дня нараджэння.

7 – Шыпіла Яўген Патафеевіч (1943, Верхнядзвінскі р-н – 1999), народны артыст Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння.

11 – Эдзі Агняцвет (сапр. Эдзі Сямёнаўна Каган; 1913, Мінск – 2000), паэтэса, кавалер ордэна «Знак Пашаны» – 100 гадоў з дня нараджэння.

13 – Галамбёўскі Лукаш Іосіфавіч (1773, Пінскі р-н – 1849), гісторык, этнограф, архівіст – 240 гадоў з дня нараджэння.

13 – Драздовіч Язэп Нарцызавіч (1888, Глыбоцкі р-н – 1954), мастак, скульптар, этнограф, фальклярыст, археолаг, пісьменнік, адзін з заснавальнікаў нацыянальнага гістарычнага жывапісу – 125 гадоў з дня нараджэння.

18 – Уладамірскі Уладзімір Іосіфавіч (сапр. Малейка; 1893, Літва – 1971), беларускі акцёр, народны артыст Беларусі, народны артыст СССР – 120 гадоў з дня нараджэння.

18 – Трэпель Абрам Яфімавіч (1908, Мінск – 1969), беларускі акцёр і рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння.

Фота Алеся САЧАНКІ

Восень на Вілейскім вадасховішчы

Жарт тыдня ад Каласка і Калінкі

З Далёкага Усходу ў Аўцюкі дайшла пасылка. Раскрыў аўцюк скрынку, а там – рыба і ікра, чырвоная і чорная. Рыбу з'елі, ікру выкінулі. Піша аўцюк пісьмо брату: «Дзякуй, каласок, рыба была вельмі смачная. А ягады, чырвоныя і чорныя, вельмі салёныя, скіслі за дарогу. Выкінулі курам…»

Новыя творы для дзяцей — новыя кнігі і імёны

У пачатку верасня былі падведзеныя вынікі конкурсу твораў для дзяцей «Экслібрыс» імя Янкі Маўра. Сябрам журы было вельмі няпроста вызначыцца з пераможцамі — сярод прадстаўленых прац былі і коміксы, і пераклады, і цэлыя праекты кніг.

Сярод 117 удзельнікаў было шмат таленавітых і вартых увагі, а ў выніку гарачых абмеркаванняў нарэшце названыя 12 фіналістаў: тры пераможцы і дзевяць дыпламантаў.

Першае месца атрымала Вольга Гапеева з казачнымі гісторыямі «Сумны суп» (узнагарода — планшэт ад кампаніі «Prestigio» і магчымасць выдаць кнігу). Другім месцам уганароўваецца Дар'я Вашкевіч з казкай «Баваўняная дзяўчынка» (твор ілюстраваны мастачкай Аленай Медзяковай), якая таксама атрымае рыдэр ад нашых партнёраў і магчымасць выдаць кнігу. Трэцяе месца займае «Чараўнік краіны Оз» Фрэнка Баўма, перастворaны на беларускую мову Сяржуком Мядзведзевым.

У дзявятку дыпламантаў уваходзяць (у алфавітным парадку): праект кнігі Сяргея Календы, Дашы Заічанкі і Ліды Наліўкі «Дзе жывуць беларускія пачваркі»; Надзея Кандрусевіч з перакладам твора Сары Лундберг «Віта Белая Крэска»; Павал Касцюкевіч з перакладам «Аўтаспынам па Галактыцы» Дугласа Адамса; Алесь Квіткевіч з перакладам першай кнігі «Хронікі Нарніі» Клайва Стэплза Льюіса (якая па-беларуску называецца «Нябож Чарадзея»); Глеб Лабадзенка з кнігай дзіцячых моўных малюнкаў «дзіцячая заМова» і з працягам гэтага праекта; Элеанора Ляхновіч з казкай «Турба-Элік і яго сябры» (твор быў ілюстраваны аўтарам); Мілана Пасанен з дзённікавымі гісторыямі «Каралева рулета», якая сталася сапраўдным адкрыццём конкурсу (аўтарцы ўсяго 13 гадоў, але яе літаратурныя здольнасці, адчуванне стылю і пачуццё гумару прыемна ўразілі сябраў журы); Наталля Рудак з перакладам «Маленькай вядзьмаркі» Отфрыда Пройслера; Ксенія Шталянкова з працягам прыгодніцкага рамана для падлеткаў «Адваротны бок люстра».

Усе фіналісты атрымалі дыпломы і спецыяльныя прызы ад ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў». Урачыстае ўзнагароджанне лаўрэатаў конкурсу «Экслібрыс» адбудзецца 12 кастрычніка ў галерэі сучаснага мастацтва «Ў».

Паводле паведамлення арганізатараў

Фота Алены КАЗЛОВАЙ

Пасяджэнне журы

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

«МОГИЛЁВСКАЯ СТАРИНА» – зборнік дакументаў і артыкулаў па гісторыі, этнаграфіі і археалогіі Магілёўшчыны, перадрукаваных з неафіцыйнай часткі «Могилёвских губернских ведомостей» за 1898–1903 гг. Выдадзены ў 3-х выпусках (1900–1903) пад рэд. Е. Раманава. У ім змешчаная Баркулабаўская хроніка (вып. 1), «Апісанне Крычаўскага графства або былога староства» А. Меера (вып. 2), дакументы і артыкулы па гісторыі Магілёва, Оршы, Быхава, Крычава і інш. населеных пунктаў, каштоўны этнаграфічны матэрыял (песні, казкі, прыказкі, павер'і, апісанні дзіцячых гульняў, лячэнне народнай медыцынай і інш.), артыкулы пра археалагічныя і нумізматычныя знаходкі, агляды архіўных фондаў па гісторыі Магілёўшчыны.



Могилевская Старина.

СБОРНИКЪ
СТАТЕЙ
„Могилевскихъ Губернскихъ Вѣдомостей"
подъ редакціей Е. Р. Романова.

Выпускъ III.

Годы 1902—1903.

Тытульны аркуш зборніка «Могилёвская старина». (вып.3)

«МОГИЛЁВСКИЕ ГУБЕ́РНСКИЕ ВЕ́ДОМОСТИ» – афіцыйная газета. Выдавалася на рускай мове ў 1838–1917 гг. Магілёўскім губернскім праўленнем. Мела 2 часткі: афіцыйную і неафіцыйную (з 14.07.1839). Да 1849 г. выходзіла нерэгулярна; да 1858 г., у 1864–1869 г. і з 1916 г. штотыднёва; у 1859–1863 гг., 1870–1903 гг. і з 1906 г. два, а ў 1904–1905 гг. тры разы на тыдзень. У афіцыйнай частцы змяшчаліся ўрадавыя ўказы і паведамленні, аб'явы і распараджэнні мясцовай адміністрацыі. У неафіцыйнай – літаратурныя творы, гісторыка- і літаратуразнаўчыя артыкулы, краязнаўчыя, этнаграфічныя і фальклорныя матэрыялы.

Першая этнаграфічная публікацыя – «Статыстычны агляд Магілёўскай губерні» (адначасова і этнаграфічны агляд; 1839, № 7–19). У 1840–1850-я даследаваліся мова, фальклор і традыцыйная абраднасць карэннага насельніцтва: «Магілёўскія павер'і. Волаты. Чараўнікі» (1850, №№ 18–19); «Машэка (Народнае паданне)» (1851, № 8); «Святочныя забаўкі ў Магілёўскай губерні» (1852, № 6) Ф. Падабеда; «Вяселле беларускіх сялянаў» М. Галынскага (1841, № 47); «Беларускія прыказкі» К. Мальчэўскага (1850, №№ 40–42, 45); «Шчадрэц» Н. Гашкевіча (1852, № 11); «Збіранне беларускіх словаў» С. Сакалова (1854, №№ 44–50); «Свята дзядоў на Беларусі» (крыптанім Павлвч М. – Паўловіч М.; 1841, № 45); «Дзяды» (крыптанім П.З.; 1849, № 17); «Беларускія прыказкі» (1850, № 45); «Беларускія імёны мужчынскія і жаночыя» (1850, № 46); «Каляда» (1852, № 3); «Святочная варажба ў Магілёўскай губерні» (1852, № 8). Характэрная рыса публікацыяў гэтага перыяду – шырокае выкарыстанне этноніма «беларусы» і назвы «Беларусь».

(Заканчэнне артыкула ў наступным нумары)

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.

Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.

Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 26.09.2013
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 888. Тыраж 1010 асобнікаў.